Мароз, В. К. Моўныя аспекты беларускага летапісання ў працах Міколы Улашчыка / В. К. Мароз// Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 44-48

В. К. МАРОЗ (Мінск)

МОЎНЫЯ АСПЕКТЫ БЕЛАРУСКАГА ЛЕТАПІСАННЯ Ў ПРАЦАХ МІКОЛЫ УЛАШЧЫКА

Разгорнутае ў часе на шмат стагоддзяў беларускае летапісанне дае магчымасць у межах летапіснага жанру прасачыць тэндэнцыі развіцця старажытнай беларускай мовы ў параўнальна-гістарычным аспекце. Лінгвістычнае даследаванне беларускіх летапісаў пераважна скіравана на сістэматызацыю ўласнабеларускіх і запазычаных моўных фактаў, выбраных па наяўных спісах. Даследчыкі гісторыі беларускай літаратурнай мовы адносяць беларускія летапісы, як мастацка-гістарычныя творы, да пісьмовых помнікаў з беларускай моўнай асновай. Надзённая задача сучаснага беларускага мовазнаўства — вывучэнне сістэмнай арганізацыі і семантычнага аб'ёму паняццяў лексікі і фразеалогіі старажытнай мовы беларускага летапісання. Даследаванне можа праводзіцца як у сінхронным плане (разгляд моўных працэсаў у межах пэўнага гістарычнага перыяду), так і ў дыяхранічным (адсочванне моўных адзінак ад старажытнасці да сучаснасці). Тэксталагічная і гістарыяграфічная база для гэтага была створана ў XIX—XX ст. Паколькі арыгіналы беларускіх летапісаў не зберагліся, прадметам навуковага лінгвістычнага даследавання служаць спісы перыяду XV—XVII ст. і хронікі XVII—XIX ст. Паводле сцверджання М.М. Улашчыка, у гістарычнай літаратуры маецца навуковае апісанне ўсіх беларускіх летапісаў (спісаў), адшуканых за два апошнія стагоддзі. Першыя 17 мелі серыю публікацый і знайшлі спарадкаванне ў XVII томе ПСРЛ (СПб., 1907), а затым разам з іншымі летапісамі ўвайшлі ў XXXII і XXXV тамы ПСРЛ (М. : Наука, 1972, 1980); яшчэ на 15 летапісаў спасылаўся гісторык Мацей Стрыйкоўскі ў сваёй «Кроніцы»[3]. М. М. Улашчык выказваў меркаванне, што гэта толькі частка той багатай літаратуры, якая мелася ў свой час [4, 237].

Абагульненне асноўных напрамкаў навуковага вывучэння і публікацыі беларускіх летапісаў зроблена М. М. Улашчыкам у манаграфіі «Введение в изучение белорусско-литовского летописания» [4]. Праца ахоплівае шырокі спектр розных пытанняў, у тым ліку звязаных з мовазнаўчымі аспектамі даследавання беларускіх летапісаў. У гістарыяграфічным аглядзе М. М. Улашчык звяртаецца да спадчыны гісторыкаў XIX ст. Пра навуковую працу І.М. Даніловіча [1], каму належыць адкрыццё і публікацыя Супрасльскага летапісу, зазначаецца: «Эта небольшая по объему (около двух печатных листов) работа казалась очень емкой по содержанию. Данилович привел о Супрасльской летописи такое количество и настолько обоснованных соображений, что они в ряде случаев не потеряли своего значения и до наших дней; вместе с тем его

высказывания о языке летописей полны противоречий» [4, 9]. Уніклівы аналіз прац І. М. Даніловіча дазволіў М. М. Улашчыку творча ўспрыняць гістарычную спадчыну даследчыка, але разам з тым, як бачым, крытычна аднесціся іменна да выказванняў пра мову летапісаў. Неабходна падкрэсліць, што навуковае даследаванне беларускіх летапісаў пачыналася ў XIX ст. найперш з увагі да іх мовы. Як вядома, І. М. Даніловіч, адстойваючы спрадвечнасць летапісання на беларускіх землях, спасылаўся на М. Стрыйкоўскага, які ўвёў у навуковы ўжытак летапісную фразу: Kniażił dzii Ringolt na Nowohorodku mnogo let, y potym dzii umierl y każuć nikotorije żeby trech synow po Ruskieje biczwie wrobil, da niit wiadoma kakowoje dzielo szietih jego synow bylo. Выключна па мове згаданага тэксту І. М. Даніловіч беспамылкова змог вызначыць, што цытата — з летапісу XVI ст., напісанага па-беларуску жыхаром ВКЛ. Усё гэта выказана ў згаданай працы «Wiadamoœż o wlaœżiwych litewskich liatopiscach», дзе мове летапісаў адведзены спецыяльны параграф, які, паводле М. М. Улашчыка, мае «не совсем вразумительное заглавие — «О литовском языке русских летописей» [4, 12]. На самой справе тут недакладнае ўспрыняцце фразы «O ruskim latopiscow litewskih jzyku» перакладаецца як «О русском летописей литовских языке» («Пра рускую мову літоўскіх летапісаў»). Сам загаловак параграфа сведчыць, што летапісы літоўскія пісаліся па-руску, а «w łacinskim lub litewskoożmudzkim jjzyku pisane nie byly» [1, 6]. І. М. Даніловіч, такім чынам, у дачыненні да летапісаў размяжоўваў дзве мовы — рускую мову і літоўска-жмудскую (litewskoożmudzki jzyk). У навуковай літаратуры прысутнічае меркаванне, што словазлучэнне руская мова варта суадносіць з пісьмова-

літаратурнай мовай ВКЛ, а назву літоўская — з жывой старажытнай беларускай мовай. Але паколькі ў летапісанні элементы вуснай беларускай мовы суседнічаюць з традыцыйнымі кніжнымі элементамі, то ў інтэрпрэтацыі гісторыкаў замацавалася тэрміналагічная блытаніна.

М. М. Улашчык пры разглядзе пытання пра выкарыстанне тэрміна русский язык у дачыненні да летапіснай мовы засяродзіўся на сцверджанні І.М. Даніловіча, што ўсе літоўскія летапісы напісаны па-руску. Прымаючы да ўвагі, што І. М. Даніловіч беларускую мову называў і літоўскаю, і рускаю, а таксама літоўскім дыялектам, М. М. Улашчык павінен быў бы засяродзіцца на сінанімічных сувязях паміж названымі тэрмінамі. І тады выснову І. М. Даніловіча, што літоўскія летапісцы ўжывалі ў сваіх творах «літоўскі дыялект», якім рускія ніколі не пісалі, М. Улашчык не інтэрпрэтаваў бы такім чынам: «Здесь Данилович хотел подчеркнуть, что русские летописи (московские, новгородские и др.) писались иным языком, чем “литовские”» [4, 13]. І. М. Даніловіч праз супастаўленне тэрмінаў літоўскія (у значэнні беларускія) летапісцы (складальнікі, перапісчыкі летапісаў) і рускія (у значэнні расійскія, а, магчыма і

ўсходнеславянскія) летапісцы выказаў думку пра моўнае адрозненне беларускага і расійскага (ці, магчыма, і ўсходнеславянскага) летапісання, у той час як М. М. Улашчык супастаўленне скіроўвае на рускія (расійскія) і літоўскія (беларускія) летапісы. І таму яму незразумела, чаму І. М. Даніловіч гаворыць «...о диалекте, притом не русском, а литовском. Подчеркивая слово «литовский», Данилович таким образом акцентировал внимание читателей на нем, утверждал, что это не описка, что автор написал именно то, что хотел, что считал верным» [4, 13].

М. М. Улашчык, як даследчык XX ст., ставячы ў апазіцыю тэрміны русский язык і литовский язык, праяўляў тым самым неадрозненне гістарычнага і сучаснага аспектаў значэння тэрміналагічнай парадыгмы літоўскі і

рускі, літоўцы і рускія. Таму і ягоную крытыку на адрас І. М. Даніловіча за змешванне паняццяў мова, дыялект, гаворка не выпадае ўспрымаць як аб’ектыўную: «Мы знаем, что это не наречие и не акцент, но в эпоху Даниловича белорусов нередко называли литвинами, а их язык литовским, и даже в конце XIXв. стоял вопрос: язык ли это (белорусский) или наречие? Правда, будучи уроженцем Белоруссии (крайнего юго-запада), Данилович, казалось бы, должен был разбираться в языке лучше, чем оказалось на самом деле...» [4, 13—14].

З пазіцый сучаснасці тэрміналагічны спектр І. М. Даніловіча сапраўды можа падацца супярэчлівым: у яго працах прысутнічаюць выразы русский язык, русско-польский язык, русское наречие, русско-литовское провинциальное наречие, litewskoożmudzki jjzyk, krajowy jzyk. Такая разнастайнасць назваў беларускай мовы атрымалася таму, што ён актыўна цытаваў іншых даследчыкаў, напрыклад Т. Нарбута: «Русское наречие принадлежитъ къ употребляемому въ южной Литве: около Пинска». «Эту именно часть Т. Нарбут считал писанною не Русским, а туземнымъ (Литовскимъ) наречиемъ, готическими рунами, на дощечках... которыя въ последствии приведены въ порядок съ переводомъ на Русский языкъ» [4, 13]. Некрытычныя спасылкі на іншых аўтараў выклікалі папрокі на адрас самога І. М. Даніловіча: «Чтобы закончить перечисление тех определений, которые давал Данилович языку летописей, добавим, что в одном случае он называл его русско-польским с примесью местных припевок» [4, 11]. Свабоднае нетэрміналагічнае словазлучэнне przypiewki wciskaj (уціскаць прыпеўкі) з цытаты «Тоэ pravie o litewskich rzec moэna, jak latopisiec p. Narbutta prylswiadcza. Lecz sґ latopiscy litewscy przez rodowitych Litwinyw pisani, і сі krajowego jzyka przypiewki wciskaj do ruskoo polskiego jzyka» было ўспрынята М. М. Улашчыкам як тэрміналагічнае, у той час як па-за ўвагаю гісторыка засталіся сапраўды тэрміны: краёвая мова (krajowy jzyk) і руска-польская мова (rusko-polski jzyk). І хоць наконт мэтазгоднасці тэрміна краёвы (краёвая мова) І. М. Даніловіч выказваў сумненні,

але тое, што ў ВКЛ летапісанне вялося спрадвеку і што працу гэтую забяспечвалі краёўцы, аўтар не аспрэчваў. Увогуле ж у дачыненні да беларускіх рэалій тэрміны краёвая мова і літоўская мова ўжываліся гісторыкамі XIX ст. як сінанімічныя.

Такім чынам, выснова М. М. Улашчыка наконт лінгвістычных поглядаў першага даследчыка беларускіх летапісаў І. М. Даніловіча («Что же касается языка, то Данилович внес в этот вопрос крайнюю

путаницу, не совсем изжитую и в наше время») [4, 15] можа быць скіравана, як гэта ні парадаксальна, і самому М. М. Улашчыку, і шмат каму з сучасных гісторыкаў.

Каштоўныя спасылкі М. М. Улашчыка на працу Я. Якубоўскага [6], прысвечаную гісторыі летапісання ў ВКЛ, дзе асвятляецца таксама і моўнае пытанне: «Этот язык Якубовский называл по-разному. Традиционно он называется русским, но в действительности «это был разговорный белорусский, который одновременно с подчинением Руси распространялся среди высшего класса в Литве. Уже во времена Ягайлы, а возможно и ранее белорусский язык употреблялся двором и литовским боярством». Далее он утверждает, что употребляемый в Литве «литовско-русский язык выделился в особый диалект, который, учитывая его первоначальный состав, можно назвать польско-белорусским» [4, 20]. Не абышоў увагаю М. М. Улашчык і меркаванне Якубоўскага пра Хроніку Быхаўца: яе склаў удзельнік бітваў пад Ведрашшу і Клецкам, што сам паходзіў з ваколіц Слуцка ці Наваградка. Часам складваецца меркаванне, што слухаеш сучаснага нам беларуса. Вялікая ўвага ў манаграфіі адведзена Магілёўскай і Віцебскай гарадскім хронікам, якія ствараліся на завяршальным этапе беларускага летапісання. Пра мову хронік зазначана, што пісаліся яны на польскай ці рускай мовах у адрозненне ад папярэдніх летапісаў, напісаных «на древнерусском или на старобелорусском языке» [4, 7].

У працах М. М. Улашчыка, на жаль, недастаткова выкарыстана аб'ёмная інфармацыя пра мову беларускага летапісання акадэміка Я. Ф. Карскага, які ў нарысе «О языке так называемых литовских летописей» праз словазлучэнне «так называемые литовские летописи» паказаў пэўную спрэчнасць ужывання намінацыі літоўскі ў дачыненні да беларускага летапісання («Скептически к названию "литовские" отнесся Е. Ф. Карский» [4, 3]). У Я. Ф. Карскага даецца разгорнутае тлумачэнне самога паняцця літоўскія летапісы: «Под

названием литовских летописей известны краткие летописные своды, содержащие сказания о событиях, касающихся бывшего Литовского государства; писаны они на официальном языке Литвы, т. е. на старом западнорусском» [2, 209]. Паколькі ў XIX ст. слова беларускі знаходзілася яшчэ ў стадыі тэрміналагізацыі і не мела пашырэння ў навуцы, то Я. Ф. Карскаму, як і іншым даследчыкам XIX ст., даводзілася аперыраваць апісальнымі выразамі тыпу старый западнорусский язык, официальный язык Литвы, а таксама западнорусское

наречие, старое западнорусское наречие, замечательно чистое западнорусское наречие старого времени, очень чистый западнорусский язык, образец языка литовско-русского і інш. Тэрмінатворчаму працэсу, скіраванаму на выпрацоўку навуковых намінацый нацыянальнай мовы беларусаў і помнікаў нацыянальнага пісьменства, нязменна спадарожнічала навуковая палеміка, якая працягваецца і да сённяшніх дзён.

Вырашальным у вызначэнні прыналежнасці летапісаў таму ці іншаму народу Я. Ф. Карскі лічыў фактар мовы. М. М. Улашчык спалучыў гэты фактар з гістарычным і ўсе помнікі летапісання, створаныя на старажытнай беларускай мове ў Вялікім княстве Літоўскім, аб'яднаў тэрмінам беларуска-літоўскія (літоўска-беларускія) летапісы: «Паколькі ў гэтых летапісах выкладаецца гісторыя Вялікага княства Літоўскага (гісторыя літоўскага і беларускага народаў), а напісаныя яны амаль усе на беларускай мове, то назва «беларуска-літоўскія» больш адпавядае сапраўднасці» [4, 180—181]. Дзякуючы навуковаму аўтарытэту доктара гістарычных навук М. М. Улашчыка такая тэрміналогія была ўспрынята даследчыкамі і трывала замацавалася ў навуковым ужытку. З 70-х гг. XX ст. даследчыкі вярнуліся да назвы беларускія летапісы, што адпавядае іх асноўным этнамоўным характарыстыкам.

ЛІТАРАТУРА

1. Данилович, И. М. О литовских летописях / И. М. Данилович // Журнал МНП, 1840. № 11. С. 70—114. (Потым гэты артыкул быў неаднаразова апублікаваны ў перакладзе на польскую мову.)

2. Карский, Е. Ф. О языке так называемых литовских летописей / Е. Ф. Карский // Труды по белорусскому и другим славянским языкам. М. : Изд-во Академии наук СССР, 1962. С. 208—250.

3. Stryjkowski, M. Kronika polska, litewska, zmodzka i wszystkiej Rusi / M. Stryjkowski. Warszawa, 1846.

4. Улащик, Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания / Н. Н. Улащик. М. : Наука, 1985.